не, галантарэйныя, тэхн. і рымарска-седлавыя вырабы. С. штучная бывае тыпу гумы, тыпу кардону, тыпу тканін з пакрыццем і інш. На Беларусі С. вырабляюць на Мінскім, Бабруйскім, Магілёўскім і Гродзенскім гарбарных заводах. С. штучную выпускае Пінскі завод штучных скур.

*Літ.*: Химия и физика высокомолекулярных соединений в производстве искусственной кожи, кожи и меха. М., 1966; Волков В. А. и Фридлянд А. А. Справочник кожевника. М., 1969. *П. К. Якабчук.* Мінск.

**СКУРАСТАКРЫ́ЛЫЯ,** вухавёрткі, (Dermaptera), атрад насякомых. Каля 1200—1300 відаў. Касмапаліты. У СССР 26 відаў.

Даўж. цела С. 4—40 *мм*. На канцы брушка прыдаткі накшталт клешчаў. Пярэднія крылы (надкрылы) цвёрдыя, вельмі кароткія, заднія перапончатыя, схаваныя пад надкрылы. Начныя насякомыя. Вільгацелюбы. Усеядныя. Іншы раз шкодзяць пладовым і ягадным культурам.

*Літ.*: Жизнь животных, т. 3, М., 1969.

**СКУРА́ТАЎ-БЕ́ЛЬСКІ** (Малюта) Рыгор Лук'янавіч [г. н. невяд.— 1.1.1573], дзярж., ваенны і паліт. дзеяч, найбліжэйшы памочнік цара Івана IV Грознага, думны дваранін (з 1570). Адзін з кіраўнікоў *апрычніны* (1569—72), у час якой вызначыўся крайняй жорсткасцю. У Лівонскую вайну (1558—83) камандаваў часткай войска; забіты пры асадзе крэпасці Вейсенштэйн (Пайдэ).

**СКУРАТО́ВІЧ** Іосіф Феафілавіч [27.9 (9.10). 1887, Мінск — 23.6.1964], удзельнік барацьбы за Сав. ўладу на Беларусі. З рабочых. Чл. КПСС з сак. 1917. Удзельнік рэв. 1905—07 у Мінску. У 1908—12 у арміі. З 1913 слесар, пам. машыніста мінскага паравознага дэпо. Пасля Лют. рэв. 1917 чл. выканкома Мінскага Савета і чл. яго бюро, чл. мінскай гарадской думы (бальшавіцкая фракцыя). Дэлегат II Усерас. з'езда Саветаў. З кастр. 1917 заг. аддзела Мінскага Савета. У 1918 камендант ст. Орша, потым у Смаленскім гарсавеце. З ліст. 1918 паліт. камісар Мінскага ваен. савета. У 1919 чл. Мінскага губ. ВРК. У 1921—22 нач. Смаленскага, потым Мінскага палітаддзелаў Аляксандраўскай чыг. З 1923 на парт. і адм.-гасп. рабоце ў Сібіры, на Каўказе, у Крыме, Маскве. *В. П. Марутка.* Мінск.



**СКУРАТО́ВІЧ** Яніна Канстанцінаўна (н. 3.7. 1930, в. Слабада Смалявіцкага р-на Мінскай акр.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). З сялян. Чл. КПСС з 1967. З 1946 палявод, з 1960 звеннявая па вырошчванню лёну ў калгасе «1 Мая» Смалявіцкага р-на Мінскай вобл. Званне Героя Сац. Працы прысвоена за высокія ўраджаі лёну. Дэп. Вярх. Савета БССР 7-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна.

**СКУРКО́** Яўген Іванавіч, гл. *Танк* Максім.

**СКУ́РНА-ВЕНЕРАЛАГІ́ЧНЫ НАВУКО́ВА-ДАСЛЕ́ДЧЫ ІНСТЫТУ́Т** Міністэрства аховы здароўя БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і практ. пытанні дэрматавенералогіі.

Засн. ў 1932 у Мінску як навуковы арганіз.-метадычны і кансультацыйны цэнтр па пытаннях дэрматавенералогіі ў рэспубліцы. Аддзелы: клінічны, лабараторна-эксперыментальны, арганіз.-метадычны. У розны час у Ін-це працавалі акад. АН БССР А. Я. Пракапчук, чл.-кар. АН БССР І. А. Вятохін. Дырэктар канд. мед. н. А. П. Комаў (з 1963).

Асн. кірункі навук. даследаванняў: распрацоўка метадаў лячэння і папярэджання туберкулёзу скуры, гнаінічковых і прафес. хвароб, псарыязу, чырвонай ваўчанкі, экземы, грыбковых, венерычных хвароб і арг-цыя барацьбы з імі; высвятленне ролі абменных працэсаў пры найб. цяжкіх і пашыраных хваробах скуры. Вынікі навук. даследаванняў: распрацаваны метады лячэння чырвонай ваўчанкі акрыхінам, электрафарэзам ранідазы, туберкулёзу скуры, сіфілісу і прафілактыкі прафес. хвароб скуры ў рабочых прамысл. прадпрыемстваў.

Выдадзены працы: «Безмыш'яковістае лячэнне сіфілісу» С. С. Гарбулёва (1959); «Клініка і лячэнне экземы» П. М. Лявоненкі (1962); «Чырвоная ваўчанка» пад рэд. А. П. Комава (1967); «Атлас сапрафітнай і паразітнай мікафлоры і мікрафаўны паталагічна зменёнай скуры чалавека» Н. І. Чарнаморцавай (1968) і інш. Ін-т выдае навук. зборнікі па дэрматавенералогіі. *А. П. Комаў.* Мінск.

**СКУ́РНЫЯ ХВАРО́БЫ** (у чалавека), пашкоджанні скуры, слізістых абалонак, пазногцяў, валасоў.

Па этыялогіі С. х. падзяляюць на: *грыбковыя хваробы скуры, дэрматыты, піядэрміі,* паразітарныя (*кароста*), прафесійныя (гл. ў арт. *Прафесійныя хваробы*), інфекцыйныя (*праказа*, хвароба Бароўскага — гл. ў арт. *Лейшманіёзы*), вірусныя (*барадаўкі*, востраканцовыя кандыломы, кантагіёзны малюск і інш.). Прычыны шэрагу С. х. (*іхтыёз, лускаваты лішай*, склерадэрмія, *пузырчатка*) не высветлены. Лячэнне: медыкаментозныя сродкі (унутр і вонкава), фіз. метады, водалячэнне, курортатэрапія. Прафілактыка: ізаляцыя і лячэнне хворых, дэзінфекцыя іх рэчаў, праверка людзей, якія былі ў кантакце з хворымі, вет. агляд свойскай жывёлы (пры інфекцыйных С. х.); прафілактычныя мед. агляды насельніцтва. У БССР пытанні этыялогіі, патагенезу, лячэння чырвонай ваўчанкі, себарэі, кароcты даследуюцца на кафедрах скурных і венерычных хвароб Віцебскага, Гродзенскага, Мінскага мед. ін-таў і ў скурна-венералагічным НДІ Міністэрства аховы здароўя (А. Я. Пракапчук, І. І. Багдановіч, Л. І. Гакінаева, Л. І. Багдановіч, А. П. Комаў і інш.).

*Літ.*: Многотомное руководство по дерматовенерологии, т. 1—3, М.— Л., 1961—64; Богданович Л. И. Ультразвук при лечении кожных болезней, 2 изд., Мн., 1967; Красная волчанка, под ред. О. П. Комова. Мн., 1967; гл. таксама літ. пры арт. *Дэрматалогія.* *Л. І. Багдановіч.* Віцебск.

**СКУ́ТЭР** (англ. scooter), лёгкае слізготнае судна з падвесным рухавіком; разнавіднасць *глісера*.

Бываюць прагулачныя С. (на 2—5 пасажыраў) і спартыўныя (звычайна аднамесныя). Магутнасць рухавіка 4—150 *к. с.* (3—110 *квт*) і большая, скорасць ходу звычайна 30—100 *км/гадз* (рэкордная больш за 150 *км/гадз*).

**СЛАБАДА́,** від паселішчаў у Расіі, на Беларусі і Украіне ў 11—18 ст. Звычайна вёска, насельніцтва якой не было прыгонным (служылыя людзі) або часова вызвалялася ад падаткаў і інш. павіннасцей (адсюль назва). Часовыя льготы даваліся, каб залучыць сялян або мяшчан у магнацкія гарады і вёскі.

С. ў гарадах (у Расіі — стралецкія, іншаземныя і інш.) падзяляліся на «белыя» — прыватнаўласніцкія (ліквідаваны ў 1649—52) і «чорныя» — дзяржаўныя, у якіх жылі рамеснікі (у 2-й пал. 17 ст. ў Мяшчанскай слабадзе ў Маскве жылі беларусы-рамеснікі, перасеЛеныя царскім урадам